Ганусевіч В.А., студ. гр. 539 ФІДК БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Тычко Г.К., докт. філал. навук, прафесар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЭКРАНІЗАЦЫЯ АПОВЕСЦІ “СОТНІКАЎ” ВАСІЛЯ БЫКАВА

Рэдкая і выключная з’ява ў кінамастацтве – экранізацыя аповесці В. Быкава “Сотнікаў”. У назве фільма Ларысы Шапіцька “Узыходжанне” (1976 г.) – сэнс шматзначны. Гэта найперш імкненне да глыбіннага спасціжэння ідэйна-філасофскага зместу найбольш значнага твора В. Быкава, заключанай у ім праблемы выбару паводзін і дзеянняў чалавека ў крытычнай сітуацыі. Адначасова гэта раскрыццё героямі сваіх гранічных магчымасцей – узыходжанне да вышынь сваёй годнасці, а таксама знаходжанне адпаведнай эстэтыкі, здольнай узняць вобразы да сімвалічнай выразнасці (некаторыя крытыкі параўноўвалі Сотнікава ў інтэрпрэтацыі рэжысёра і вобліку В. Плотнікава з Хрыстом, а Рыбака (У. Гасцюхіна) – з Іудам: фільм дае падставы да падобных паралеляў) [2, С. 10].

Ва “Узыходжанні” Л. Я. Шапіцька прадстала мастаком магутнага таленту, яркай індывідуальнасці. У інтэрв’ю кінакрытыку Ю. Рыбаку Ларыса Яфімаўна гаварыла, што зварот да аповесці “Сотнікаў” для яе быў асабліва неабходны ў момант духоўнага крызісу, які яна перажыла пасля няўдачы з фільмам “Ты і я” і цяжкой хваробы. Таму аповесць-роздум пра смерць і бессмяротнасць, веру і адступніцтва бачылася “толькі як гісторыя пра сябе. Пра чалавека, які мог быць народжаны на 30 год раней, які трапіў у вядомую ўсім трагічную сітуацыю, прайшоў усе выпрабаванні, прапоўз усе гэтыя метры па снезе сам, сам гінуў, сам здраджваў, сам выжываў, сам вылічваў для сябе формулу бессмяротнасці і сам прыходзіў да тых адкрыццяў, да якіх прыйшоў Сотнікаў” [3, С. 62].

Былы настаўнік, савецкі афіцэр, партызан, зведаўшы неймаверныя пакуты ад гестапаўскіх катаў, здрады Рыбака, які разам з ім трапіў у палон, не адрокся ад сябе, ад ідэй, у якія паверыў. У святле сённяшняй грамадскай

сітуацыі Сотнікаву можна начапіць ярлык “фанатык ідэі”, а Рыбака паспрабаваць нейкім чынам рэабілітаваць: маўляў, не было іншага выхаду выжыць, як паспрабаваць ашукаць немцаў, даць згоду служыць ім, каб потым перайсці да сваіх… Л. Шапіцька, услед за аўтарам аповесці, трымаецца іншай пазіцыі: здрадніцтва нічым нельга апраўдаць – ні ў якія часы: яно амаральна… [9, С. 41].

Каляровае рашэнне фільма – ён чорна-белы – не толькі стылёвая прыкмета. Гэта вобраз максімалісцкага раздзялення духоўнай прасторы фільма на кантрасты, на белае і чорнае. У двухкаляровай гаме фільма дубліруецца ўлюбёная думка Васіля Быкава аб немагчымасці трэцяга шляху для асобы, калі наступае час выбару [7, С. 6]. Тым самым падкрэсліваецца адмова рэжысёра – услед за Быкавым – ад паўтаноў, ад змякчаючых акалічнасцяў, ад пабочных момантаў, якія могуць толькі змазаць жорсткую вызначанасць маральнай калізіі – памерці з гонарам або жыць у ганьбе.

Для таго каб супасці са светам Быкава, увайсці ў яго, мала суперажываць яго героям. Трэба ў самім сабе несці тую бескампрамісную маральную патрабавальнасць, якая ўласціва яго героям. Каб брацца за Быкава, трэба быць мастаком падобнага светаўспрыняцця.

Аўтары экранізацыі не толькі не аслабілі вастрыні і актуальнасці сітуацыі, калі героі – партызаны Сотнікаў і Рыбак стаяць перад выбарам: або жыццё цаною здрады, або смерць з годнасцю няскоранага чалавека. Творчая група Л. Шапіцькі ўзняла гэты канфлікт да ўсяленскага супрацьстаяння дабра і зла, духоўнасці і бездухоўнасці. Фільм паказвае цярністасць шляху, па якім узыходзілі: адзін (Сотнікаў) да сваёй чалавечай вышыні, другі (Рыбак) – да падзення ў бездань. Супрацьлегласць гэтых характараў-вобразаў (па светапогляду, маральных якасцях, інтэлекту) вызначаны дакладнай рэжысёрскай канцэпцыяй, трапным выбарам выканаўцаў роляў. Паводзіны, псіхалагічны стан і знешні малюнак Сотнікава (Б. Плотнікава) і Рыбака (У. Гасцюхіна) такія, што за імі не толькі кантрасныя натуры; яны носьбіты розных маральна-светапоглядных узроўняў. А калі Сотнікаў сутыкаецца з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

былым савецкім грамадзянінам Партновым (выдатна сыграная роль А. Саланіцына), які свядома перайшоў да немцаў, – фільм набывае маштаб ідэалагічнага паядынку.

Амаль кожная сцэна “Узыходжання” мае неадназначны сэнс і выразны пластычна-вобразны малюнак. У кульмінацыйнай па канцэпцыі сцэне паядынку Сотнікава і Партнова графіка кадра падкрэслена строгая, падначаленая выяўленню кантраснасці знешняга малюнка і ўнутранага стану персанажаў. Сотнікаў – фізічна слабы, унутрана перакананы, Партноў з выгляду ўпэўнены, а па сутнасці разгублены, з затоеным разуменнем свайго становішча. Быламу культработніку, які зрабіўся паліцэйскім следчым, вельмі хацелася даказаць, што і Сотнікаў, калі як след “націснуць” – будзе весці сябе амаральна, як і кожны, хто трапіў у безвыходную сітуацыю… Не даказаў, фізічныя пакуты (з выпальваннем пяціканечнай зоркі на грудзях) не зламілі Сотнікава і паядынак выйграў ён, хаця і ведаў, што жывым застацца не выпадзе.

Даследчыкі кінематографа ўжо далучылі да шэдэўраў рэжысёрскага і аператарскага мастацтва фінальны эпізод фільма “Узыходжанне” – шлях Сотнікава на сваю Галгофу [1, С. 4]. Працяглая панарама па заснежанай дарозе, што вядзе на ўзвышак, запаволены праход па ёй кінакамеры ўслед за рухам знямоглага Сотнікава, затуманены гарызонт, на якім бачны сілуэт шыбеніцы; перакрыжаваны мантаж кадраў Сотнікава і Партнова (у недарэчным капялюшы з апушчанымі да вачэй палямі), нямецкага афіцэра і здранцвелага Рыбака (праз хвіліну паліцай загадае яму выбіць падстаўку з-пад ног Сотнікава з накінутай на тонкую шыю пятлёй). Кадры гэтыя ўтвараюць вобраз Галгофы, на якую ўзыходзіць чалавек.

Абвостраная графічная пластыка, метафарычная вобразнасць “матэрыялізацыі” акрэсленай пісьменнікам завостранай сітуацыі, выразныя эмацыянальна-сэнсавыя акцэнты пра ўвасабленні характараў галоўных герояў узнімаюць фільм “Узыходжанне” да мастацка-філасофскай прытчы, што адпавядае зместу і жанравым асаблівасцям аповесці “Сотнікаў” (хаця

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нарадзілася яна, як сведчыць сам аўтар, з рэальных фактаў вайны 1941 – 1945 гг.) [6, С. 101].

Л. Шапіцька пайшла далей за іншых (В. Бялоў, У. Распуцін, А. Вампілаў) у накірунку неапрытчы, як у той час патрабавала яе задума: сувымераць геройства і здрадніцтва мерай духоўнасці. Усё гэта, разам узятае – этычны пасыл, новы погляд на традыцыйную тэму, асваенне новай этычнай формы, – і вызначае ўнікальнасць "Узыходжання" як мастацкай з'явы. Не прытрымліваючыся літары аповесці, Л. Шапіцька наблізілася да яе глыбіннай сутнасці, а па сіле мастацкага ўвасаблення ў нечым і пераўзышла [9, С. 40].

Калі талент накладваецца на талент, нараджаецца новае, абавязкова нечым адметнае. Так і адбылося пры экранізацыі Л. Шапіцькі аповесці В. Быкава "Сотнікаў". "Так ужо здарылася, – пісаў Васіль Быкаў у "Літаратурнай газеце" 11 ліпеня 1979 г. у сувязі з трагічнай смерцю Л.Я. Шапіцькі, – што менавіта гэта яна – слабая жанчына і цудоўны рэжысёр – узваліла на сябе цяжкую глыбу труднейшага матэрыялу і ўпэўнена паднялася з ёю на адну з вышынь сучаснага кінематографа. У ёй жыў мужны мастак сучаснага кіно, урокі якога не страцяць сэнсу і для будучых пакаленняў кінематаграфістаў".

У 1977 г. фільм атрымаў прэмію "Залаты мядзведзь" на міжнародным кінафестывалі ў Берліне, а таксама галоўны прыз на ўсесаюзным кінафестывалі ў Рызе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Бакшеева, Г. Здравствуй, Сотников! / Г. Бакшеева // Гродненская правда. – 1976. – 17 сентября. – С. 4;

2. Бондарава, Е. Л. Кінематограф і літаратура: творы В. Быкава на экране / Е.Л. Бондарава; Праўл. т-ва "Веды" БССР. – Мн., 1991. – С. 10 – 12;

3. Бондарава, Е. У кожнага свая вышыня: нататкі пра экранізацыя твораў В.Быкава / Ефрасіння Бондарава // Мастацтва Беларусі. – 1990. – №9. – С. 60 – 64;

4. Бондарева, Е. Повести и фильмы. Произведения В. Быкова на экране / Е. Бондарева// Неман. – 1977. – №10. – С. 158 – 167;

5. Бугаёў, Дз. Эпапея працягваецца/ Дзмітрый Бугаёў // Васіль Быкаў: нарыс жыцця і творчасці/ Дзмітрый Бугаёў. – Мн., 1987. – С. 194 - 205;

6. Быков, В. Как создавалась повесть “Сотников” / В. Быков// Литературное обозрение. – 1973. – №7. – С. 100 – 102;

7. Громов, Е. Последний поединок Сотникова / Евг. Громов// Литературная газета. – 1977. – 20 апреля. – С. 6;

8. Карахан, Л. Интервью Ларисы Шепитько/ Л. Карахан// Искусство кино. – 1976. – №10. – С. 10 – 11;

9. Стишова, Е. Хроника и легенда/ Е. Стишова// Искусство кино. – 1977. – №9. – С. 30 – 41.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ